Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 САКАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 43 (28407)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Пад зоркай Францыска Скарыны**

СТАР. 3



**Масажыст, які бачыць рукамі**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Сёлета ў Брэсцкай вобласці асноўную частку новых працоўных месцаў маркуецца ствараць суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Перад намі стаіць задача — даць магчымасць чалавеку арганізаваць уласную справу. Трэба ствараць умовы для сярэдняга і буйнога бізнесу, дзе будуць працоўныя месцы для многіх людзей. Не менш важна аказваць падтрымку і індывідуальным прадпрымальнікам. У цэлым у рэгіёне ў гэтым годзе плануецца стварыць не менш за 6,5 тысячы працоўных месцаў — у асноўным на мікра- і малых арганізацыях, якія адкрываюцца. Чакаецца, што ў вобласці запрацуе 685 новых кампаній».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9002 | ▲ |
| Еўра | 1,2000 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0700 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17043>

9 771990 763008

# Прыгожа — значыць бяспечна



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі ўнітарнага прадпрыемства «Зеленгас» Кастрычніцкага раёна Мінска пілуюць дрэвы ў аварыйным стане і пашкоджаныя часам і ветравалам таполі, клёны і ліпы, якія ўяўляюць небяспеку для жыхароў сталічных вуліц Валадзько і Магілёўскай.

■ Жыллё

## НОВЫЯ КВАРТАЛЫ — ТОЛЬКІ З ІНФРАСТРУКТУРАЙ

### Жылыя дамы і дзіцячыя садкі цяпер павінны будавацца адначасова

**Будаўнічай галіне цяпер неабходна арыентавацца на далейшае зніжэнне выдаткаў і стварэнне камфортнага і зручнага жылля, паставіў задачу намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН падчас выніковай калегіі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. Паводле яго слоў, пры правядзенні экспертызы больш не будуць прапускацца спрошчаныя варыянты, бо трэба ствараць комплексную забудову жылога асяроддзя.**

Менавіта аб перспектывах развіцця тэрыторый жылой забудовы карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з **начальнікам галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Галінай ПАЎЛАВАЙ.**



***— Пытанні аб недастатковай сацыяльнай інфраструктуры ўздымаюцца не ўпершыню. Гэта тэма на сёння забяспечана заканадаўчай базай?***

— Узвядзенне жылых раёнаў гарадоў ажыццяўляецца ў краіне на падставе горадабудаўнічых планаў агульнага і дэталёвага планавання ў адпаведнасці з рэгламентам забудовы. Там дакладна прапісана, дзе і якія аб'екты дазваляецца размяшчаць. Яшчэ ў студзені 2014 года ўступіў у сілу Указ кіраўніка дзяржавы №26 «Аб удасканаленні будаўнічай дзейнасці», дзе канкрэтна прапісана, што раёны жылой забудовы павінны забяспечвацца ўсімі мінімальна неабходнымі аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры. Гэта магазіны, аптэкі, школы, дзіцячыя садкі, а таксама пажарныя дэпо — усё, што ўплывае на бяспеку насельніцтва і забяспечвае яго спрыяльным асяроддзем пражывання.

СТАР. 2

■ Тэхналогіі

## ЯК ПРЫМУСІЦЬ ПЛАНШЭТ «ЗАГАВАРЫЦЬ»?



**Мабільныя апараты адыгрываюць усё большую ролю ў жыцці чалавека. Можна сказаць, гэта прадметы, без якіх ужо немагчыма абысціся, у тым ліку і злачынцам. Як прымусіць смартфон ці планшэт «загаварыць»? Адказ на гэта ведаюць спецыялісты ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па горадзе Мінску.**

Прыкладна палова мабільных прылад трапіла да экспертаў па крымінальных справах, звязаных з ужываннем і незаконным абарачэннем наркотыкаў.

У сувязі з гэтым спецыялістам прыходзіцца даваць адказы на мноства пытанняў, якія тычацца гісторыі і часу наведванняў разнастайных інтэрнэт-рэсурсаў, вызначэння самых наведвальных вэб-старонак на мабільным тэлефоне ці планшэце, здабыцця электроннай перапіскі, у якой могуць захоўвацца сляды злачыннай дзейнасці.

— Мы даём поўны пералік сайтаў, якія наведваліся, і на падставе зробленых заключэнняў супрацоўнікі па наркакантролі альбо следчыя правоздзяць далейшыя дзеянні, — расказвае **дзяржаўны судовы эксперт аддзела тэхнічных экспертыз упраўлення спецыяльных і тэхнічных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па г. Мінску Аляксей ДВОРНІКАЎ.**

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ГАРАНТЫЯ ДАБРАБЫТУ

## Прэзідэнт прапанаваў В'етнаму скарыстацца беларускім вопытам у сферы бяспекі

**З В'етнамам, які знаходзіцца на іншым баку мацерыка, наша краіна супрацоўнічае даўно і грунтоўна. Прычына таму — добрыя кантакты, што захаваліся яшчэ з савецкіх часоў, падобная знешняя палітыка, накіраваная на канструктыўныя адносіны з рознымі дзяржавамі і забеспячэнне міру і стабільнасці ў рэгіёне. Акрамя гэтага, дзяржавы падтрымліваюць трывалыя сувязі на самым высокім палітычным узроўні. Выдатна наладжана супрацоўніцтва і ў сферы бяспекі.**

Відаць, невыпадковым з'яўляецца і той факт, што напярэдадні 100-гадовага юбілею беларускай міліцыі нашу краіну наведаў **міністр грамадскай бяспекі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам спадар ТО ЛАМ.** Сёння, калі свет ледзь не штодзённа сутыкаецца з выклікамі тэрарызму і экстрэмізму, калі наркотыкі цэняцца даражэй за золата, супрацоўніцтва паміж краінамі, нават геаграфічна аддаленымі адна ад адной, іграе асаблівую ролю.

*— Мы радыя, проста шчаслівыя, што В'етнам — гэта азіяцкая краіна, якая бурна развіваецца. Гэта краіна з велізарным — амаль 100-мільённым насельніцтвам, краіна, якая не толькі патрэбная Беларусі, але і мы гэтай краіне патрэбныя,* — адзначыў **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА,** вітаючы госця з В'етнама.

Па словах кіраўніка дзяржавы, адным з галоўных фактараў імклівага развіцця В'етнама з'яўляецца стабільнасць і бяспека гэтай дзяржавы. Беларусь гатова падзяліцца сваім вопытам у згаданай сферы:

*— Я разумею, што галоўнае ўсюды — людзі, кадры. Калі вас задавальняе тая падрыхтоўка кадраў, якая існуе ў Беларусі, мы гатовы зрабіць усё для таго, каб у цэлым сістэму або яе элементы перанесці на в'етнамскую глебу. Мы павінны ўсё рабіць для таго, каб людзі маглі свабодна перамяшчацца з В'етнама ў Беларусь і наадварот. У той жа час мы павінны паставіць заслон рознага кшталту дрэнным людзям і аб'яднаць нашы намаганні ў барацьбе са злачыннасцю, наркатрафікам, тэрарызмам.*

У гэтым плане краіны ўжо даўно заклалі фундамент для ўзаемадзеяння. Першыя кантакты паміж Міністэрствам унутраных спраў Беларусі і Міністэрствам грамадскай бяспекі В'етнама адбыліся яшчэ ў 2000 годзе, з таго часу сувязі толькі ўмацоўваліся. Арганізавана супрацоўніцтва па падрыхтоўцы кадраў. На платнай аснове прайшлі навучанне тры групы в'етнамскіх спецыялістаў-кінолагаў на базе кіналагічнага цэнтра в/ч 6713 Магілёва. Навучанне в'етнамскіх супрацоўнікаў праходзіць у Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і на базе Міжнароднага навучальнага цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у сферы міграцыі і супрацьдзеяння гандлю людзьмі. У 2010 і 2011 гадах таксама на платнай аснове прайшлі навучанне групы супрацоўнікаў на розных курсах. Сума кантрактаў тады склала прыкладна 140 тысяч долараў ЗША.

Што да іншых кірункаў супрацоўніцтва краін, то тут сапраўды ёсць, пра што гаварыць. Як слушна адзначыў кіраўнік дзяржавы, В'етнам — адзін з самых прыярытэтных партнёраў Беларусі ў сваім рэгіёне:

*— За апошнія 10 гадоў мы стварылі матэрыяльны фундамент і аснову нашых адносін, мы павялічылі тавараабарот у тры разы. Больш за тое, мы намецілі сур'ёзную дарожную карту развіцця нашых адносін, і гэта ставіць В'етнам у шэраг самых прыярытэтных, асноўных нашых партнёраў у Паўднёва-Усходняй Азіі.*

Спадар То Лам выказаў вялікую падзяку кіраўніку нашай дзяржавы за магчымасць сустрэцца. Ён падкрэсліў, што яго краіна вельмі зацікаўлена ў беларускім вопыце, тэхналогіях. Таксама ён перадаў прывітальныя словы ад старшыні Камуністычнай партыі В'етнама і ад Прэзідэнта В'етнама.

# Беларусь — Польшча: 25 год дыпламатычных адносін

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Польшчы Анджэя Дуду з 25-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Упэўнены ў перспектыўнасці развіцця беларуска-польскіх кантактаў ва ўсіх сферах, пашырэнні прагматычнага і канструктыўнага супрацоўніцтва ў інтарэсах народаў Беларусі і Польшчы», — гаворыцца ў віншаванні.

«Агульны гісторыяй нам наканавана побач жыць і вырашаць усе пытанні шляхам дыялогу на карысць міру, стабільнасці і бяспекі ў Еўропе», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Анджэю Дуду моцнага здароўя і поспехаў на адказнай дзяржаўнай пасадзе, міру і дабрабыту ўсяму польскаму народу.

У віншаванні Прэзідэнта Польшчы, якое паступіла ў адрас кіраўніка беларускай дзяржавы, Анджэй Дуда выказаў надзею, што чарговая чвэрць стагоддзя адносін будзе перыядам плённага супрацоўніцтва паміж дзвюма незалежнымі дзяржавамі, заснаванага на ўзаемаразуменні і даверы, якое пасадзейнічае дабрабыту грамадзян, умацаванню бяспекі і міру ў Еўропе.

# НЕ ТОЛЬКІ ТАВАРААБМЕН

**Учора ў Палацы Незалежнасці адбылася сустрэча Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра ЛУКАШЭНКІ і Прэзідэнта Грузіі Гіоргія МАРГВЕЛАШВІЛІ.**

Нагадаем, напярэдадні кіраўнікі дзяржаў правялі афіцыйныя перамовы, у ходзе якіх бакі пацвердзілі зацікаўленасць ва ўмацаванні беларуска-грузінскага ўзаемадзеяння на ўсіх узроўнях і ва ўсіх сферах, што ўяўляюць узаемную цікавасць.

* * *

Учора таксама адбылася сустрэча **Гіоргія МАРГВЕЛАШВІЛІ і Андрэя КАБЯКОВА, прэм'ер-міністра нашай краіны.** На думку кіраўніка Саўміна, Беларусь і Грузія павінны пашыраць наменклатуру ўзаемных паставак. «Мы будзем надзвычай радыя магчымасці пастаўкі большай наменклатуры, большай колькасці прадукцыі. І мы зацікаўлены ў прадукцыі нашых грузінскіх партнёраў, многае з таго, што вы робіце, немагчыма выраблць у нас у сілу кліматычных умоў. Будзем радыя, калі мы намецім сумесныя планы не толькі па простым тавараабмене, але і па ўзаемных інвестыцыях — мы гатовыя да абмеркавання і гэтых пытанняў», — адзначыў беларускі прэм'ер.

Андрэй Кабякоў лічыць, што Грузіі, акрамя агучаных прэзідэнтамі прапаноў па супрацоўніцтве, будзе цікавы беларускі вопыт і ў сферы генеральнага планавання гарадскога і рэгіянальнага развіцця, арганізацыі руху грамадскага транспарту, работы камунальных службаў. «Пад гэты і іншыя праекты гатовыя забяспечыць пастаўкі сучаснай пасажырскай і камунальнай тэхнікі», — адзначыў ён.

Значны патэнцыял прэм'ер-міністр бачыць і ў выкарыстанні інфраструктуры тэхнапаркаў Рэспублікі Беларусь і Грузіі для прасоўвання сумесных навуковых праектаў, развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва і падрыхтоўкі IT-спецыялістаў. «Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы зможам забяспечыць выхад нашых адносін на якасна новы ўзровень», — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Баевікі ІД пакінулі большую частку Пальміры

**Сірыйскія ўрадавыя войскі і апалчэнцы вядуць баі з экстрэмістамі ў заходніх раёнах горада і прасоўваюцца да цэнтра. Прасоўванне ўскладняецца тым, што баевікі замініравалі дамы і дарогі і пакінулі тэрарыстаў-смяротнікаў.**

Новае наступленне сірыйскай арміі пад Пальмірай пачалося ў сярэдзіне студзеня 2017 года. Вясной 2016-га ўрадавыя войскі пры падтрымцы расійскай авіяцыі выбілі баевікоў з горада, аднак у снежні таго ж года яны зноў захапілі яго.

Гістарычныя помнікі старажытнай Пальміры прызнаны ЮНЕСКА сусветнай культурнай спадчынай. За час валодання горадам ісламісты знішчылі шэраг бясцэнных помнікаў культуры.

## Калумбійскія паўстанцы пачалі раззбройвацца

**Больш як 52 гады ішла ў Калумбіі грамадзянская вайна з левымі паўстанцамі. Цяпер у краіне пачаўся пераход да мірнага жыцця.**

Прадстаўнікі місіі ААН у Калумбіі прыступілі да ажыццяўлення кантролю за працэсам раззбраення баевікоў леварадыкальнай паўстанцкай групоўкі «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі — Армія народа» (FARC-EP). Пра гэта паведамілі ў прэс-цэнтр Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Чакаецца, што працэс зойме тры месяцы і завершыцца 29 мая, праз 180 дзён пасля ўступлення ў сілу канчатковага пагаднення паміж урадам і паўстанцамі.

## Опра Уінфры задумалася аб удзеле ў прэзідэнцкіх выбарах



**Амерыканская тэлевядучая Опра Уінфры больш не выключае свайго ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах у ЗША — пасля абрання прэзідэнтам Дональда Трампа.**

У інтэрв'ю тэлеканалу Bloomberg яна заявіла, што перамога Трампа на выбарах, нягледзячы на адсутнасць у яго палітычнага вопыту, прымусіла і яе задумацца пра магчымасць вылучэння ўласнай кандыдатуры.

63-гадовая тэлезорка, якая на мінулых выбарах падтрымлівала саперніцу Трампа Хілары Клінтан, раней адмаўлялася ад любых пытанняў пра свае палітычныя амбіцыі. На працягу 25 гадоў Опра была вядучай найпапулярнейшага ў ЗША ток-шоу, якое так і называлася «Шоу Опры Уінфры». Яна з'яўляецца адной з самых вядомых публічных фігур як у ЗША, так і ў іншых краінах. Яе багацце, паводле ацэнак Forbes, складае каля 3 млрд долараў, што робіць яе 30-й найбагацейшай жанчынай Злучаных Штатаў.

Летась падчас выбарчай кампаніі Дональд Трамп заяўляў, што не адмовіўся б ад кандыдатуры Опры Уінфры на пасаду віцэ-прэзідэнта ў выпадку сваёй перамогі.

# НОВЫЯ КВАРТАЛЫ — ТОЛЬКІ З ІНФРАСТРУКТУРАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— У свой час я хадзіў у школу, якая ў раённым цэнтры стаяла ўпрытык да жылога дома...***

— Цяпер пры развіцці тэрыторый павінны выконвацца і санітарныя нормы, дзе абавязкова прапісваецца адлегласць ад жылых дамоў да найбліжэйшых школьных устаноў. Гэта адлегласць рэгламентуецца ў залежнасці ад шчыльнасці насельніцтва. Увогуле, любое развіццё гарадскіх тэрыторый робіцца на падставе зацверджанага дэталёвага плана, дзе ўдакладняецца, якія аб'екты па гэтых нормах там павінны быць. Колькасць іх вызначаецца ў залежнасці ад змяшчальнасці школ, паліклінік, а таксама іншых нюансаў. А вось мясцовыя органы ўлады павінны адсочваць на сваёй тэрыторыі захаванне гэтых нормаў.

***— У ідэале гэта так. Але мая сярэдняя дачка ў новым мікрараёне сталіцы два гады не магла пайсці ў дзіцячы садок, бо яго проста не было побач.***

— Сітуацыя знаёмая. У сувязі з тым, што школы і дзіцячыя садкі фінансуюцца з бюджэту горада, то нярэдка іх будаўніцтва спазняецца. Відавочна, што спачатку адбываецца ўзвядзенне ліквідных аб'ектаў — жылля, дзе арганізатары атрымліваюць гарантаваны прыбытак. А вось будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў пераносіцца на больш позні тэрмін. А гэтага не павінна быць. Менавіта таму наша міністэрства падрыхтавала адпаведны інфармацыйны ліст выканкамам. У гэтым дакуменце мясцовым уладам рэкамендуецца пры выдзяленні інвестару зямельных участкаў пад будаўніцтва жылля абавязкова паведамляць апошнім, што на гэтай тэрыторыі пакуль не выконваюцца нормы па забеспячэнні пажарным дэпо і іншымі аб'ектамі інфраструктуры. Інвестар ужо на першапачатковым этапе павінен разумець, што менавіта ён будзе будаваць тут нейкія аб'екты інфраструктуры ў якасці дадатковай нагрузкі.

Адзначу, што гэта тычыцца схемы будаўніцтва камерцыйнага жылля. Пры ўзвядзенні жылля па дзяржзаказе і з выкарыстаннем ільготных крэдытаў існуе крыху іншы алгарытм будаўніцтва інфраструктуры. А з камерцыйным будаўніцтвам мясцовым уладам пажадана загадзя акрэсліць у сваіх рашэннях тое, якія аб'екты сацыяльнай інфраструктуры будзе будаваць горад, а якія — інвестар. І гэта бакі павінны ўдакладняць ужо на старце развіцця тэрыторый. У такім выпадку будучы арганізатар будаўніцтва будзе свядома вырашаць, ці займацца яму гэтым аб'ектам, ці не.

***— Атрымліваецца, што цяпер будаўніцтва жылля і аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры павінна адбывацца паралельна?***

— Вядома. Не павінна ўзнікаць сітуацый, калі жылы раён ужо заселены, а ў ім доўгі час няма інфраструктуры. Адсочваць падобныя моманты павінны мясцовыя органы ўлады, якія выдаюць дазволы на ажыццяўленне праектавання і будаўніцтва жылых дамоў. Менавіта яны кантралююць паслядоўнасць узвядзення ўсіх запланаваных будынкаў і збудаванняў на сваёй тэрыторыі.

***— Ваша ўпраўленне займаецца распрацоўкай, а пры неабходнасці і карэкціроўкай усіх нормаў па развіцці тэрыторый. Аднак кантралююць выкананне заканадаўства іншыя структуры. На практыцы атрымліваецца не заўсёды ўсё гладка?***

— На жаль, часам здараюцца адзінкавыя выпадкі з падобнымі праблемамі. Напрыклад, шмат было скаргаў ад жыхароў новага дома ў раёне вуліцы Каліноўскага г. Мінска. Там людзі купілі элітнае жыллё за сур'ёзныя грошы, а, па сутнасці, атрымалі ката ў мяшку. Першапачаткова ім абяцалі, што побач з домам будуць пабудаваны дзіцячы садок і школа, а ў выніку было прынята рашэнне ўпрытык пабудаваць яшчэ адзін жылы дом. Заўважу, што гэта ўжо з'яўляецца прамым парушэннем дэталёвага плана забудовы.

***— Як прадухіліць паўтарэнне падобных сітуацый?***

— Галоўным заслонам для такіх парушэнняў павінна стаць дзяржаўная экспертыза праектных рашэнняў. А калі праект не адпавядае дэталёваму плану забудовы, то будаўніцтва яго трэба забараняць ужо на гэтай стадыі. А вось калі аб'ект пабудаваны, то выпраўляць памылкі будзе значна больш складана. На наш погляд, спецыялісты дзяржэкспертызы павінны больш жорстка падыходзіць да ўзгаднення праектнай дакументацыі. Тут жылы будынак трэба разглядаць не толькі як каробку і канструкцыю, а больш уважліва звяртаць увагу на адпаведнасць горадабудаўнічым нормам, якія зацверджаны дэталёвым планам асваення тэрыторыі. Так, наша ўпраўленне можа карэктаваць гэтыя нормы ў сувязі з ушчыльненнем раёнаў, але такія змяненні не павінны выходзіць за межы прынцыповых момантаў дэталёвага плана забудовы. А экспертыза павінна надзейна адсякаць неправамерныя рашэнні мясцовых улад.

***— Разам з тым яшчэ сустракаюцца выпадкі, калі падчас заключэння дагавораў з фірмай-забудоўшчыкам агучваюцца адны ўмовы, а пры засяленні аказваецца, што сацыяльнай інфраструктуры побач з домам няма...***

— Гэта пытанне асобна ўздымалася на мінулай калегіі Мінбудархітэктуры. Тады было вырашана, што жыллё не павінна будавацца асобна ад узвядзення сацыяльнай інфраструктуры. Так, у гарадах не заўсёды хапае ўласных сродкаў, каб будаваць інфраструктуру своечасова. Значыць, грошы трэба эканоміць і зніжаць выдаткі. У сувязі з гэтым міністэрства зацвердзіла гранічныя нарматывы кошту па такіх аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры, як фізкультурна-аздараўленчыя комплексы, дзіцячыя садкі і школы. Дакумент прадугледжвае дакладнае адсочванне і мэтазгоднасць выкарыстання пэўных аб'ёмаў бюджэтных сродкаў на ўзвядзенне такіх аб'ектаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# СВЯТКУЕМ РАЗАМ

## Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання выйдуць новыя кнігі і будзе прадстаўлены дакументальны фільм




**2017 год у нашай краіне праходзіць пад зоркай Скарыны, ён адзначаны святкаваннем паўтысячагадовага юбілею беларускай кнігі. І хоць кульмінацыяй рэспубліканскай праграмы стануць жнівень-верасень — менавіта ў гэты час адбудзецца найбольшая колькасць самых знакавых імпрэз, — ужо сёння можна казаць пра рэалізаваныя кніжныя праекты, а таксама анансаваць важныя выстаўкі, спектаклі і фільм.**



Фота БЕЛТА.

Так, **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** расказаў, што беларускія выдаўцы яшчэ летась і ў пачатку года прадставілі шэраг кніжных навінак, прысвечаных першадрукару. У выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» пабачыла свет трохтомная дзіцячая энцыклапедыя, прысвечаная Скарыну, а кніга «Францыск Скарына — чалавек свету» прыйшла да чытача дзякуючы падтрымцы Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы.

— Сёлета яшчэ пабачыць свет персанальная энцыклапедыя, прысвечаная асобе і дзейнасці Скарыны і яго паслядоўнікаў. Падобная кніга на беларускай і рускай мовах ужо выходзіла ў 1990-х гадах і сёння з'яўляецца сапраўдным рарытэтам. Таксама рыхтуецца трэцяе перавыданне кнігі «Францыск Скарына на мовах народаў свету», дзе прадмову да кнігі «Юдзіф» можна прачытаць у перакладзе на дзясяткі моў, — заўважыў намеснік міністра.

Тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання будзе гучаць не толькі ў нашай краіне. Пад знакам Скарыны пройдуць дні беларускай культуры ў іншых дзяржавах. **Наталля ЗАДЗЯРКОЎСКАЯ, начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры,** паведаміла, што ў хуткім часе адбудуцца дні беларускай культуры ў Кітаі, Ізраілі, Грузіі, а тэму скарыніяны ахвотна падхапілі аб'яднанні беларусаў замежжа — у Польшчы, Літве, Расіі. Наталля Іванаўна падкрэсліла, што ўжо завяршыліся здымкі дакументальнага фільма «Першадрук», які летась стаў пераможцам конкурсу кінапраектаў. Прэм'ера стужкі адбудзецца ў Полацку, падчас святкавання Дня беларускага пісьменства. Беларускіх гледачоў парадуюць яшчэ адной прэм'ерай — спектаклем пра Скарыну па п'есе Віктара Марціновіча. Гэтую пастаноўку рыхтуе Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі.

Увосень беларусы змогуць пабачыць арыгіналы кніг, выдадзеных Скарынам і паплечнікамі, якія захоўваюцца ў розных краінах свету. Гэты маштабны і складаны праект рыхтуе **Нацыянальная бібліятэка. Дырэктар установы Раман МАТУЛЬСКІ** зазначыў, што сёння вядома пра існаванне 520 кніг, надрукаваных Скарынам. Яны захоўваюцца амаль у 50 краінах, найбольшая колькасць — у Расіі, Польшчы, Германіі, Чэхіі. Нацыянальная бібліятэка таксама сёлета завяршае сумесны з банкам БелВЭБ 21-томны праект факсімільнага ўзнаўлення кніжнай спадчыны першадрукара.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «Найлепшыя тэксты — пра беларускую вёску»


Фота Надзеі БУЖАН.

**Мікалай СМЯХОВІЧ, загадчык цэнтра новай і найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт:**

— «Звязда» — гэта тая газета, якая павінна быць у кожнага беларуса. І не толькі з той прычыны, што мы мусім ведаць, якая грамадская думка цяпер пануе. Не толькі таму, што выданне змяшчае рознабаковыя матэрыялы, якія могуць быць цікавыя і моладзі, і людзям старэйшага пакалення; і тым, хто працуе ў школе і ў дзяржаўных установах, — усім.

Калі мы гаворым, што любім родную мову і сваю краіну, як жа можам абыякава ставіцца да нацыянальнай прэсы, тым больш на беларускай мове? Праяўляць гэтую неабыякавасць можна не толькі словам і заявай, а канкрэтнай справай — мець «Звязду» ў сваёй паштовай скрыні. Тым больш што ў адрозненне ад інтэрнэту ў «Звяздзе» адчуваецца подых жыцця, які прыходзіць да чытача, калі бярэш у рукі газету, калі пазнаеш аўтара артыкула па першым сказе.

Больш за ўсё мне падабаюцца аналітычныя матэрыялы аб развіцці сельскай гаспадаркі. Шмат аўтэнтычных публікацый пра тое, як і чым жыве беларуская вёска, пра яе традыцыі, абрады, пра людзей. Таксама з цікавасцю чытаю радкі з каментарыямі аб палітычных падзеях у краіне і за яе межамі. Гэта дапамагае займаць актыўную грамадскую пазіцыю, разумець, якія працэсы адбываюцца ў грамадстве і ў свеце, чаму ўладамі прымаюцца тыя ці іншыя рашэнні. Даспадобы артыкулы культурніцкага плану: аб літаратуры і мастацтве. Люблю чытаць апавяданні, нарысы, якія друкуе «Звязда».

Калі бяру ў рукі свежы нумар газеты — дакладна ведаю, што ў ім адшукаецца што пачытаць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

# Як беспрацоўнаму пацвердзіць, што ён хварэў

**Згодна з Дэкрэтам №3 часовая непрацаздольнасць, пацверджаная лістком (або даведкай) непрацаздольнасці, або яго (яе) дублікатам, лічыцца перыядам, на працягу якога чалавек прызнаецца ўдзельнічаючым у фінансаванні дзяржаўных расходаў. Міністэрства аховы здароўя растлумачыла, як пацвердзіць бальнічны лісток грамадзянам, якія не мелі ў 2015—2016 гадах работы.**

Для гэтага чалавеку трэба звярнуцца ў паліклініку альбо іншую арганізацыю аховы здароўя, якая аказвала яму медыцынскую дапамогу. Факт, што беспрацоўны быў часова непрацаздольны і звяртаўся па медыцынскую дапамогу, будзе вызначаць урачэбна-кансультацыйнай камісіяй (УКК) гэтай паліклінікі (арганізацыі аховы здароўя).

Гаворка ідзе аб аказанні дапамогі ў сувязі з вострым захворваннем, абвастрэннем хранічнага захворвання, аператыўнымі ўмяшаннямі. Таксама гэта тычыцца перыяду медыцынскага назірання за жанчынамі падчас цяжарнасці, родаў і пасляродавага перыяду.

Пры гэтым урачэбна-кансультацыйная камісія (УКК) аналізуе інфармацыю, якая змяшчаецца ў медыцынскай карце амбулаторнага хворага за 2015—2016 гады: глядзіць дату (даты) звароту пацыента па медыцынскую дапамогу, дыягназ, тэрміны аказання дапамогі ў амбулаторных умовах (для жанчын — тэрміны цяжарнасці, дату родаў), сярэднія аптымальныя тэрміны часовай непрацаздольнасці і інш.

Спецыялісты Міністэрства аховы здароўя падкрэсліваюць, што выпіска з медыцынскіх дакументаў, у якой змяшчаецца рашэнне УКК аб наяўнасці (або адсутнасці) у грамадзяніна прыкмет часовай непрацаздольнасці за канкрэтны перыяд часу, калі яна афармляецца для мэт рэалізацыі нормаў дэкрэта №3, не будзе ўказваць дыягназ пацыента.

Што тычыцца аказання медыцынскай дапамогі ў стацыянарных умовах, то гэты факт пацвярджаецца эпікрызам медыцынскай карты стацыянарнага пацыента (альбо яго дублікатам).

Звярніце ўвагу, што, пачынаючы з гэтага года, пры афармленні медыцынскіх дакументаў для вызначэння таго, што маецца неабходнасць у доглядзе за хворым дзіцем ва ўзросце да 14 гадоў (дзіцем-інвалідам — ва ўзросце да 18 гадоў) альбо за хворым членам сям'і, абавязкова трэба паказваць інфармацыю аб асобе, якая ажыццяўляе гэты догляд. За 2015—2016 гады пацвярджэнне факта, якая менавіта асоба ажыццяўляла догляд за названай катэгорыяй грамадзян, практычна немагчымае, бо гэтая інфармацыя не заўсёды ўказаная ў медыцынскіх дакументах.

Падрабязней азнаёміцца з парадкам пацвярджэння часовай непрацаздольнасці можна на сайце Міністэрства аховы здароўя.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ІМКЛІВАЯ ВЯСНА

## У выхадныя сонейка прыгрэе месцамі да плюс 16 градусаў

**Даволі цёплае, але дажджлівае надвор'е чакаецца ў Беларусі ў першай дэкадзе сакавіка, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**



Сіноптыкі адзначаюць, што па тэмпературным рэжыме сёлета сакавік больш нагадвае пачатак красавіка. А ў пятніцу ў нас чакаецца няўстойлівае надвор'е. Пад уплывам атмасферных франтоў ноччу, удзень пераважна па паўночнай частцы краіны пройдзе кароткачасовы дождж з мокрым снегам. Па паўночным усходзе краіны чакаецца моцны парывісты вецер. Максімальная тэмпература паветра складзе 2—7 цяпла.

Істотна цяплець пачне ў выхадныя. У суботу з ростам атмасфернага ціску надвор'е палепшыцца, калі на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Будзе пераважна без ападкаў, толькі па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай чакаюцца слабы туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла. Удзень — 3—10 цяпла, а па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 14 градусаў. У нядзелю да нас завітаюць яшчэ больш актыўныя атмасферныя франты і цёплыя паветраныя масы, якія рухаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Уначы ў паўночных і паўночна-заходніх раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў. Удзень будзе 9—16 цяпла, толькі ў паўночных раёнах прагрэюцца да 6—8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на старце наступнага тыдня будзе цёпла, але не абыдзецца і без ападкаў. У панядзелак уначы па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 цяпла, а ўдзень — ад плюс 5 да плюс 12 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 15 цяпла. У аўторак кароткачасовыя дажджы прагназуюцца пераважна па заходняй палове краіны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень — 3—10 цяпла, а па поўдні — да плюс 12 градусаў.

Увага! У сувязі з цёплым надвор'ем у найбліжэйшыя дні на рэках Беларусі працягнецца актыўнае разбурэнне ледзянога покрыва. Сіноптыкі паведамляюць, што на вадаёмах яшчэ захоўваецца ледзяное покрыва, але выходзіць на лёд небяспечна, бо там адзначаюцца расколіны, а месцамі лёд пацямнеў і актыўна растае.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### У КЛІЧАВА З'ЯВІЎСЯ СВОЙ БРЭНД

**Ініцыятыва грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» выбраць сабе ў якасці сімвала якую-небудзь птушку была падтрымана на Клічаўшчыне. Раён лясны, акцэнт у сваім развіцці робіць менавіта на экалагічны складальнік, птушак тут болей чым дастаткова. Апыталі насельніцтва, правялі круглы стол і прыпыніліся на сойцы. Яна перамагла з больш чым двух дзясяткаў прапанаваных на выбар прэтэндэнтаў.**

— З улікам народнага меркавання дэпутаты на нядаўняй сесіі зацвердзілі гэты сімвал, — паведаміў **старшыня Клічаўскага райсавета Уладзімір КНІГА.** — Райвыканкаму даручана распрацаваць пералік мерапрыемстваў па яго папулярызацыі. Аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны» пацвердзіла сваю гатоўнасць намаляваць на фасадзе аднаго з жылых дамоў горада сойку. Дом раместваў ужо пачаў працаваць над тым, як растыражаваць сімвал з дапамогай сваіх вырабаў. Разглядаецца таксама магчымасць выкарыстаць гэты сімвал як ініцыятыву па брэндзіраванні раёна і паўдзельнічаць у праграмах ПРААН або Глабальнага экалагічнага фонду. Добра будзе, калі пад гэты праект атрымаецца яшчэ і знайсці грошы.

У Клічаве лічаць, што сойка самы адпаведны сімвал для раёна. Яна сустракаецца ў тутэйшых лясах, садзейнічае з'яўленню дубраў. Птушка гаспадарчая, дзелавітая і вельмі сімпатычная, кажуць жыхары.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### АЎТАРЫТЭТНЫЯ ДАРАДЧЫКІ

Стратэгічны савет па праўядзенні Года навукі створаны ў Беларусі

**У яго склад увайшлі кіраўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, навуковых і іншых арганізацый, устаноў адукацыі, вядучыя вучоныя Рэспублікі Беларусь з розных галін навукі. Старшынёй Стратэгічнага савета зацверджаны старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір Гусакоў, намеснікамі старшыні — міністр адукацыі Ігар Карпенка і старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Аляксандр Шумілін.**

Савет з'яўляецца кансультацыйна-дарадчым органам. Яго асноўныя задачы будуць сканцэнтраваны на выпрацоўцы рашэнняў і дзеянняў, скіраваных на павышэнне эфектыўнасці і далейшае развіццё навуковай і інавацыйнай дзейнасці ў краіне, умацаванне ўзаемадзеяння навукі з галінамі эканомікі і сацыяльнай сферай. Савет будзе выпрацоўваць таксама рэкамендацыі на перспектыву — па навукова-тэхналагічным развіцці Рэспублікі Беларусь да 2030 года...

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

### ЗАГАРЭЛАСЯ ПАСЦЕЛЬНАЯ БЯЛІЗНА

**Мінскія ратавальнікі з-за пажару ў інтэрнаце эвакуіравалі 200 чалавек.**

Здарэнне адбылося ў канцы працоўнага дня ў будынку інтэрната па вуліцы Сурганава: тут спрацавала пажарная сігналізацыя «Маланка». У памяшканні пральні загарэліся складзіраваныя там пасцельныя рэчы. Агонь пашкодзіў маёмасць, керамічную плітку на сцяне, закураныя памяшканне. Работнікі МНС і адміністрацыя эвакуіравалі з будынка па двух лесвічных маршах 200 чалавек. Прычына пажару ўстанаўліваецца, версія, якая разглядаецца, — неасцярожнае абыходжанне з агнём неўстаноўленай асобы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



# ЛЯЧЭБНЫЯ П'ЯЎКІ, АРАМАПАКОЙ І МАСАЖЫСТ, ЯКІ БАЧЫЦЬ РУКАМІ

## Чым здзіўляе санаторый «Рудня»

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Мінскі трактарны завод» вядома ва ўсім свеце не толькі сваёй вытворчасцю, але і, як аказалася, медыцынскай службай. Пацвярджэнне таму — замежныя грамадзяне, не кажучы ўжо пра беларусаў, што ледзь не за паўгода заказваюць пуцёўкі ў санаторый «Рудня», які, дарэчы, уваходзіць у філіял завода «Медыцынскі цэнтр МТЗ».**

Як расказаў намеснік дырэктара — **начальнік комплексу філіяла Юрый МАЗОЛЬ**, медыцынская служба прадпрыемства ўсяго на год маладзейшая за сам завод: 1 сакавіка ёй споўнілася 70 гадоў. Асаблівы гонар службы — санаторый «Рудня», дзе адначасова могуць папраўляць здароўе 250 чалавек.

Медыцынскі профіль санаторыя вельмі шырокі: прафілактыка і лячэнне захворванняў органаў кровазвароту, дыхання, страванання, касцёва-мышачнай і нервовай сістэмы. Акрамя добра ўсім знаёмых, але тым не менш эфектыўных працэдур, як электрасвятлолячэнне, гразевыя абкручванні сакскімі гразямі, тэрматэрапія, водалячэнне (ванны, душы, падводны масаж), інгаляцыі, у наведвальнікаў санаторыя ёсць шанц апрабаваць некаторыя методыкі ўпершыню ў жыцці.

Напрыклад, спелеатэрапія, падчас якой можна не толькі падлячыцца, але і «прымераць» на сябе прафесію шахцёра. У санаторыі ёсць спецыяльна абсталяваны пакой, сцены якога выкладзеныя салянымі блокамі з салігорскіх шахтаў, акрамя таго, у памяшканні распыляецца ёдаваная соль, з-за чаго ствараецца ўражанне, што ты ў імгле. Калі вам здаецца, адзінае, што патрабуецца ад пацыента, — выседзець пэўны час, вы памыляецеся. На самай справе, чымсьці сеансы нагадваюць імправізаваныя канцэрты, падчас якіх хорам співаюць і дэкламуюць вершы. І гэта не праява нейкай асаблівай уласцівасці солі, якая прымушае весяліцца, проста ў працэсе «гаварэння» карысныя рэчывы лепш засвойваюцца.

З саляных шахтаў можна адправіцца наўпрост на бераг акіяна. Мабыць, менавіта таму вялікай папулярнасцю сярод наведвальнікаў карыстаецца арамапакой. І справа нават не толькі ў дабратворным уплыве пэўных пахаў на арганізм, а ў агульнай атмасферы расслабленасці, ці, як цяпер модна казаць, рэлаксацыі. Гэтаму спрыяе прыемная музыка або гукі прыроды, асабліва часта выбіраюць шум прыбою, а таксама праекцыя зорнага неба. Калі няма супрацьпаказанняў, пах можна выбраць на свой густ ці яго ў адпаведнасці з дыягназам прызначыць урач.



Невідушчы спецыяліст Максім МАЕЎСКІ робіць класічны масаж.

Араматэрапія — гэта, вядома, цудоўна, але ўсё ж такі няма нічога больш эфектыўнага для расслаблення, чым масаж. У санаторыі «Рудня» працуе асаблівы спецыяліст, да якога пацыенты імкнуцца вяртацца з году ў год. Гэта тлумачыцца тым, што Максім Маеўскі не проста лечыць рукамі, ён імі бачыць. Малады чалавек — інвалід па зроку першай групы, але гэта не перашкодзіла яму знайсці сваё пакліканне. Яшчэ з дзяцінства Максім цікавіўся медыцынай, марыў стаць хірургам, аднак ужо да адзінаццатага класа страціў 50% зроку. Тым не менш вырашыў не развітвацца з любімай сферай і вывучыўся на масажыста.



Касметычны кабінет. Падрыхтоўка да нанясення альгінатнай маскі.

— Ведаеце, любая праца няпростая, калі яе выконваць добра. Але тое, чым я займаюся, для мяне вельмі цікава. Розныя людзі, розныя гісторыі, з кожным трэба знайсці агульную мову — хіба гэта не захапляльна? — разважае таленавіты масажыст.

У санаторыі Максім Маеўскі працуе ўжо амаль дзевяць гадоў. Тут створаны ўсе ўмовы для яго камфортнага пражывання і працы. Наогул, гэта не першы для санаторыя вопыт супрацоўніцтва з невідушчымі: добрым спецыялістам, незалежна ад асаблівасцяў іх здароўя, тут заўсёды рады.

**Загадчыца лячэбнага аддзялення Алена ВАБІШЧЭВІЧ** адзначае, што поруч з суперсучаснымі тэхналогіямі не губляюць сваю актуальнасць і вядомыя тысячагоддзямі методыкі лячэння. Напрыклад — гірудатэрапія, або, прасцей кажучы, лячэнне п'яўкамі. Як спецыяліст у гэтай вобласці, Алена Анатолеўна заўважыла, што прасцей сказаць, ад чаго п'яўкі не дапамагаюць, чым пералічыць іх лекавыя ўласцівасці. З усімі кірункамі медыцынскага профілю санаторыя яны спраўляюцца «на ўра». Першыя працэдуры працягваюцца 15—20 хвілін, у далейшым могуць даходзіць і да дзвюх гадзін, у залежнасці ад таго, як хутка насычаецца п'яўка. А вось крывацячэнне пасля працэдуры можа доўжыцца і суткі, але гэта ідзе толькі на карысць, чалавек нават не адчувае слабасці. У методыкі практычна няма ўзроставых абмежаванняў: п'яўкі могуць лячыць як дзяцей, так і пажылых людзей, але толькі адну зону за раз.

Нароўні з агульным аздараўленнем арганізма ў санаторый прыязджаюць і па «порцыю» прыгажосці. У касметычным кабінеце на выбар прапаноўваюць вялікую разнастайнасць працэдур, многія з якіх немагчыма правесці самастойна. Можна выбраць курс, накіраваны на пахудзенне, што асабліва актуальна напярэдадні летняга сезона. Агульнаму ўмацаванню арганізма дапамогуць гарбаты з багатага на выбар фітабара. А нацешыцца прыгажосцю навакольнага асяроддзя з карысцю для здароўя можна, займаючыся папулярнай цяпер скандынаўскай хадой у маляўнічых ваколіцах санаторыя.

Нягледзячы на тое, што санаторый адносіцца да Мінскага трактарнага завода, наведаць яго могуць усе ахвотныя, а работнікам сферы аховы здароўя і адукацыі і наогул прадастаўляецца зніжка. Што да замежных грамадзян, то жыхарам зоны ЕАЭС паслугі аказваюцца па тым жа кошце, што і беларусам. Самая аптымальная працягласць аздараўлення — 18 дзён. Выгадна вылучае санаторый «Рудня» тое, што на гэты перыяд у кошт пуцёўкі ўключана па 8 сеансаў тых працэдур, якія прызначыць урач. Ёсць сфарміраваны пакет працэдур і на 12 дзён, у цэлым жа наведвальнік санаторыя можа выбраць любую зручную для яго колькасць дзён і пералік паслуг, калі яны не супярэчаць яго стану.

**Віншуем калектыў філіяла і ўсіх ветэранаў медыцынскай службы з 70-гадовым юбілеем арганізацыі. Жадаем у першую чаргу моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, плённай працы і сямейнага дабрабыту!**

УНП 102379342

**Больш даведацца пра санаторый і заказаць пуцёўку можна на афіцыйным сайце www.sanrudnia.by або ў г. Мінску па тэл. (017) 392-00- 25 і маб. (029) 349-16-69 ці ў санаторыі па тэл. (01774) 201-10 і маб. 8 (044) 590-24-64.**

# ЯК ПРЫМУСІЦЬ ПЛАНШЭТ «ЗАГАВАРЫЦЬ»?



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Апарат можа змяшчаць звесткі, здольныя кардынальна паўплываць на ўстанаўленне факта злачынства ці на яго раскрыццё. Аднойчы ў Мінску дзяўчына выкінулася з акна. Было незразумела: яна сама наклала на сябе рукі ці ж нехта ўсё-такі ёй «дапамог». Мабільны тэлефон, які знайшлі на месцы здарэння, быў перададзены нам. Падчас аналізу інфармацыі мы знайшлі фотаздымак. Ён уяўляў сабой сэлфі нябожчыцы, зробленае на краі балкона. І гэта акалічнасць аказала дапамогу ў прыняцці рашэння.

Год таму ўвесь свет абышла гісторыя, як Федэральнае бюро расследаванняў ЗША ўзламала IPhone, які належаў так званаму «стралку з Сан-Бернардына». На гэта спатрэбілася некалькі тыдняў. Амерыканская структура тады звярталася па дапамогу да ізраільскай фірмы Celebrity, якая ў рэшце рэшт і дапамагла ўзламаць IPhone, нягледзячы на тое, што вытворца наадрэз адмовіўся раскрываць сакрэты доступу да інфармацыі ўнутры апарата. Гэтая ж арганізацыя паставіла абсталяванне і беларускім судовым экспертам.

— Да нас радыёэлектронная прылада паступае ва ўпакаваным выглядзе, — расказвае Аляксей Дворнікаў. — Пасля гэтага ўпакоўка фатаграфуецца. Гэта важна — каб не ўзнікла прэтэнзій, што апаратам карысталіся ў нейкіх іншых мэтах. Велізарная колькасць апаратаў паступае да нас поўнасцю разраджанай, таму неабходны час на зарадку батарэі. Спробы схаваць ці знішчыць акумулятар да апарата будуць беспаспяховыя. Так, у нас няма батарэй да ўсіх магчымых мадэляў мабільных прылад. Але трымаць такую калекцыю зусім і неабавязкова. На нашым узбраенні стаіць універсальная батарэя: вальтаж ва ўсіх апаратаў аднолькавы, бо з'яўляецца сусветным стандартам. Пасля зарадкі мабільная прылада падключаецца да нашага абсталявання. І спецыяльная праграма капіруе ўсе даныя на патрэбны носьбіт.

Іншая справа, колькі часу зоймуць гэтыя маніпуляцыі. Напрыклад, вывудзіць усю неабходную інфармацыю з найпрасцейшай «званілкі» цалкам рэальна за 15—20 хвілін. Такія тэлефоны шмат інфармацыі не змяшчаюць. Гэта тэлефонная кніга, SMS, журнал званкоў, нататкі. Са смартфонамі складаней — там ужо знаходзяцца відэафайлы, фатаграфіі, паведамленні чатаў, гісторыя прагляду старонак у браўзеры.

— Ёсць кітайскія апараты, якія ствараюць дадатковыя праблемы з-за сваёй малараспаўсюджанасці, — гаворыць эксперт. — Там выкарыстоўваюцца працэсары, спецыфікацыі якіх у свеце мала вывучаны. З-за недастатковай распаўсюджанасці інфармацыі аб тэхнічных складніках працэс экспертызы можа зацягнуцца. Але нічога невыканальнага тут няма.

Таксама час экспертызы залежыць ад таго, запаролены тэлефон ці не. Быў выпадак, калі ўзлом пароля ў эксперта заняў цэлы дзень. Таму са старымі тэлефонамі прасцей. Хоць «званілак» зараз не так шмат. Прычым цікава, што і дагэтуль на стол экспертаў трапляюць апараты з «гісторыяй». Напрыклад, не так даўно спецыялісты даставалі інфармацыю з апарата фірмы Siemens. І гэта прытым што апошні тэлефон такой маркі сышоў з канвеера 12 гадоў таму! Ці, напрыклад, не так даўно трапіўся SonyEricsson, выпушчаны наогул на пачатку тысячагоддзя. З сучасных жа мадэляў часцей за ўсё эксперты аналізуюць змесціва апаратаў марак Texet, Keneksi, Nokia.

— Часцей за ўсё апараты паступаюць да нас па матэрыялах праверкі ці па крымінальных справах, — зазначае Аляксей Дворнікаў. — Але да нас могуць смела звяртацца і фізічныя асобы, каб вырашыць звычайныя сітуацыі, звязаныя з захоўваннем інфармацыі на носьбітах. Напрыклад, нехта рыхтаваў дакумент, запісаў яго на флэшку і... выпадкова выдаліў. Або пры захаванні адбыўся нейкі збой, і дакумент перастаў карэктна адкрывацца. Ці, напрыклад, на картцы памяці кудысьці прапалі патрэбныя фотаматэрыялы і відэазапісы. Судовая экспертыза радыёэлектронных прылад і электрабытавой тэхнікі такую інфармацыю аднавіць здольная. Праўда, гэта будзе каштаваць грошай.

### Цікава ведаць

**Летась спецыялісты Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз правялі больш за 300 даследаванняў смартфонаў і планшэтаў.**

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# Якасць гульні і вынік — на першае месца

## Нацыянальную зборную па футболе ўзначаліў Ігар КРЫВУШЭНКА



**Пасада, якая так доўга заставалася вакантнай, нарэшце, знайшла свайго ўладальніка. Пасля адстаўкі Аляксандра Хацкевіча, які быў галоўным трэнерам зборнай на працягу двух гадоў, прайшло ўжо тры месяцы. За гэты час агучваліся імёны многіх кандыдатаў — гэта і Алег Конанаў, і Віктар Скрыпнік, і Аляксандр Барадзюк, і Леанід Кучук, і Валерый Карпін, і іншыя. Сярод іх — і Ігар Крывушэнка, з якім было дасягнута пагадненне.**

Пакуль Крывушэнка прызначаны выконваючым абавязкі галоўнага трэнера, але прыстаўка «в. а.» з'яўляецца толькі юрыдычнай фармальнасцю, на найбліжэйшым пасяджэнні выканкама Беларускай федэрацыі футбола Ігар Мікалаевіч будзе зацверджаны ў якасці галоўнага трэнера нацыянальнай каманды.

Адначасова ён працягне ўзначальваць і каманду «Тарпеда-БелАЗ». Як адзначае афіцыйны сайт жодзінскага клуба, сумяшчэнне было ўмовай, пры якой настаўнік пагадзіўся на прапанову ўзначаліць нацкаманду.

— *Кіраваць зборнай заўсёды прыемна і ганарова, але ў той жа час і адказна. Разумею, што дадасца велізарны кавалак работы. Гэта — выклік, а на выклік заўсёды хочацца адказаць годна,* — сказаў у інтэрв'ю АБФФ-ТБ Ігар Крывушэнка.

Пакуль не агучаны імёны памочнікаў новага галоўнага трэнера, але настаўнік адзначыў, што ў яго ўжо ёсць варыянты, спатрэбіцца ўсяго 2—3 дні, каб закрыць гэтае пытанне.

— *У першую чаргу мая мэта — гэта стварэнне адзінага калектыву, які ў кожнай гульні будзе змагацца за перамогу. Старацца паказваць якасны футбол, але вынік ставіць на першае месца — план такі,* — дадаў Ігар Мікалаевіч.

Дэбют 53-гадовага настаўніка ў нацыянальнай зборнай адбудзецца 25 сакавіка ў Стакгольме, дзе беларускія футбалісты правядуць адборачны матч чэмпіянату свету — 2018 супраць каманды Швецыі.

Нагадаем, сваю гульнявую кар'еру Ігар Крывушэнка пачаў у сталічным «Дынама», затым выступаў у гродзенскім «Нёмане», лідскім «Абутніку», якуцкім «Дынама», камандзе «Селенга» з Улан-Удэ. Трэнерскую дзейнасць ён пачаў у магілёўскім «Тарпеда-Кадзіна», а ў 2005-м узначаліў барысаўскі БАТЭ, з якім двойчы выйграў «золата» чэмпіянату Беларусі (2006, 2007). У 2008 годзе пад кіраўніцтвам Крывушэнкі мінскае «Дынама» стала сярэбраным прызёрам нацыянальнага першынства. У 2009-м спецыяліст перайшоў у новасібірскую «Сібір» і ўпершыню вывеў яе ў элітны дывізіён чэмпіянату Расіі, а ў наступным годзе, таксама ўпершыню, каманда стала фіналістам Кубка краіны і дэбютавала ў Лізе Еўропы. З 2012 года Ігар Крывушэнка трэніруе жодзінскі клуб, у мінулым сезоне тарпедаўцы ўпершыню сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



Старэйшыя жанчыны ў вёсцы Тонеж збіраюцца ў хаце, дапамагаюць адна адной прыбірацца да свята, спяваюць песні і адзначаюць «Чырачку» за традыцыйным сталом.

# «Вясну-красну — на вулачку, а зімачку — у каморачку»

## Абрад, што дорыць радасць і здароўе на ўвесь год

**МЯСЦОВЫЯ кажуць: чым больш падчас свята назбіраеш «чырачак» — адмысловага пячэння ў форме птушкі, тым шчаслівейшым і багацейшым будзе год. І гэта не дзіўна, бо кожная гаспадыня, дорачы «чырачку», зычыць добрага здароўя, шчасця і сілы. Вось і наш карэспандэнт пад канец зімы разам з камандай праекта «Наперад у мінулае» выправілася на Палессе — гукаць вясну, вітаць птушак і набірацца моцы на ўвесь год. Тут, у вёсцы Тонеж Лельчыцкага раёна, у апошні дзень перад пачаткам Велікоднага посту традыцыйна ладзяць унікальны абрад «Чырачка». Праграма выйдзе ў эфір тэлеканала «Беларусь 3» у нядзелю, 5 сакавіка, мы ж ужо сёння раскажам, як гукалі вясну на Гомельшчыне.**

Удзельнікам агульнага вялікага свята тут можа зрабіцца кожны: жанчыны з радасцю пазычаць каляровую ваўняную хустку, якая засцеражэ ад зімовага холаду і стане знакам далучанасці да грамады. Яшчэ адзін знак, што аб'ядноўвае ўсіх падчас абраду, — самі чырачкі, якіх не шкадуюць для гасцей. Дарэчы, у кожнай гаспадыні — свой рэцэпт гэтага вясновага пячэння. Нехта замешвае цеста на сыроватцы, а нехта — на малацэ. Так, Надзея Дрынеўская, у чыёй хаце зазвычай пачынаецца святкаванне, падзялілася з намі сваім рэцэптам.

— У муку дадаём малако, два яйкі, соду, соль, цукар, лыжачку маянэзу — каб было смачней. Цеста замешваецца, раскачваецца, і з яго нажом выразаюцца чырачкі, якія па форме павінны нагадваць птушак. Вочкі я раблю з сухіх чарніц. Чырачак мы кладзём у кошыкі. Каго сустрэнем па дарозе да месца святкавання — таго і частуем, жадаем добрага здароўя. Нехта адразу з'ядае пячэнне, а нехта захоўвае на акенцы цэлы год — да наступнага гукання вясны.

Рыхтавацца да свята ў Тонежы пачынаюць загадзя. Гаспадыні пякуць бліны і аладкі, вараць кашу, кісель — гэтымі стравамі на Чарнышоўскіх горах, месцы правядзення абраду, будуць частаваць усіх удзельнікаў. У лесе знаходзяць прыгожую пышную ёлачку, якую ўпрыгожаць дзеці і якая стане сімвалам надыходу вясны. Таксама ладзяць пудзіла зімы — яно сімвалічна згарыць у цэнтры агульнага вялікага карагода.

Да падрыхтоўкі абраду далучаюцца літаральна ўсе вяскоўцы. Мужчыны запрагаюць коней і ўпрыгожваюць іх збрую. Жанчыны адзяваюць святочныя строі, а пасля, сабраўшыся ў хаце Дрынеўскіх, спяваюць песні. Загадзя рыхтуецца талая вада. Лічыцца, што яна надзвычай чыстая і ў гэты дзень набывае гаючую сілу. Перад тым як выйсці з двара, усе ўдзельнікі свята абмыюць твары — каб былі прыгожымі і моцнымі, гаючай вадой напояць кароў і коней.

Дзеці збіраюцца ў адной з хат і стужкамі, папяровымі кветкамі ўпрыгожваюць ёлку. У даўнія часы, калі не было каляровай паперы, адмыслова для свята белую паперу фарбавалі рознымі колерамі. Імкнуліся, каб ёлка выглядала як мага прыгажэйшай. Гэтае святочнае дрэва тут лічыцца сімвалам роду і знакам пачатку новага года. Існуе павер'е, што кветак на дрэве павінна быць цотная колькасць — тады дзеўкі і хлопцы знойдуць сабе пару, у іх з'явяцца дзеці, і вёска будзе жыць далей.

Вось пачуліся галасы дзяцей, якія нясуць упрыгожаную ёлачку ў двор. Абрад пачаўся.

*Ой ты, ёлачка кучарава.*
*Стаяла, шумела,*
*У бору стаяла, шумела.*
*На горы стала — зацвяла,*
*Ой ты, ёлачка кучарава.*

З дапамогай такой песні ўжо ў хаце захапляюцца ёлачкай. Раз яна зацвіла — значыць зіма скончылася, трэба на высокім месцы гукаць вясну і заклікаць птушак. Гаспадыня нясе гаршчок з зернем, у яго паставяць ёлачку — каб год быў багаты, усе былі здаровыя і вясёлыя.

Для абраду «Чырачка» жыхары і госці Тонежа (а іх у гэты дзень прыязджае ў вёску нямала) збіраюцца разам і ідуць на Чарнышоўскія горы. Нехта едзе на вазах, запрэжаных прыбранымі коньмі, нехта ідзе пешкі да месца агульнага святкавання.

Але нельга лічыць, што тыя, хто не трапіў на гару, застаюцца па-за атмасферай радасці і весялосці. Самыя старэйшыя жанчыны вёскі, якія не маюць сіл узняцца на пагорак і вадзіць карагоды, таксама збіраюцца разам, надзяваюць касцюмы, дапамагаюць адна адной прыбрацца для абраду і спяваюць песні. Напрыклад, вось гэтую:

*Ой, чырочко-пташэчко,*
*не залетай далечко,*
*Не занось мого венчыка,*
*Бо мой венчык — потрэбчык:*
*Трэба братка жаніці,*
*А сестрыцу й отдаваць.*
*А сестрыцу отдаваць,*
*Да веселлейко спраўляць.*

Яны адзначаць «Чырачку» за традыцыйным сталом з пячэннем, блінамі і кісялём.



Грамада дзяцей кіруецца да месца пачатку абраду з упрыгожанай ёлачкай — сімвалам роду і пачатку года.

Мы ж рушым на гару, адкуль ужо чуецца вясновая-заклікальная: «Ой, гу, вясна, ой, гу, красна... Ой, што ты нам вунесла...» Падчас абраду гукання вясны водзяць карагоды, якія складаюцца з трох колаў. Першае ўтвараюць дзеці, другое — маладыя людзі ў перадшлюбным узросце, а трэцяе — жанчыны сталага ўзросту. Усе разам гуляюць у традыцыйную гульню «Грушка», спяваюць песні. Спачатку спальваюць пудзіла зімы на вялікім вогнішчы, а затым — развітваюцца з ёлачкай. Крыху пазней адзін хлопчык возьме ўпрыгожанае дрэўца, пабяжыць да самага высокага дрэва на гары, залезе як мага вышэй на яго — бліжэй да сонейка — і ўладкуе ёлачку на галінах. Гэта стане сімвалам прыходу вясны, а гаршчок з зернем, у якім неслі ёлачку на гару, застанецца ахвярай для птушак, якія прыляцяць з выраю.

Пазней усіх чакае пачастунак і, бадай, самая вясёлая частка абраду — качанне з гары. Пакачацца не адмаўляюцца нават самыя сталыя ўдзельнікі свята. Лічыцца, што ў гэты час зямля дае сілы арганізму, таму хваробы адступяць і чалавек застанецца здаровым цэлы год. Верце ці не, але сталыя ўдзельнікі «Чырачкі» пацвярджаюць праўдзівасць гэтай прыкметы.

...Мы вярнуліся з Тонежа з добрым настроем, цэлым выраем «чырачак» і мноствам добрых зычанняў. Так, вясна прыйшла!

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «СА «ЗВЯЗДОЙ» — УСЁ Ў ПАРАДКУ!»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 4 сакавіка па 30 чэрвеня 2017 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал 2017 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб.кап. | Усяго з ПДВ, руб.кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Пыласос Bosch GAS 20 L SFC 0.601.97B.000, Венгрыя** | 1 | 354,00 | 354,00 |
| 2 | **Прас Tefal FV2325, Францыя** | 7 | 72,00 | 504,00 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» складае: — 858,00 (Восемсот пяцьдзясят восем) рублёў.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал 2017 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2017 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 4 сакавіка па 7 красавіка 2017 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 4 па 31 сакавіка 2017 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 7 красавіка 2017 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі.

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1-й катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 12 красавіка 2017 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прасаў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — пыласос.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 22 красавіка 2017 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 22 красавіка 2017 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2017 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2017 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2017 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 чэрвеня 2017 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2017 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Са «Звяздой» — усё ў парадку!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2944 ад 01.03.2017 выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Купон удзельнікаў гульні — у заўтрашнім нумары «Звязды».**

## Серада, 8 сакавіка

### Беларусь 1

**7.30 Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!»***
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.30, 0.55 Серыял «Сваты-6».**
**10.40, 12.10 Меладрама «Жанчына яго мары».***
**15.10, 21.40 Серыял «Дзённік свякрухі».***
**21.00** Панарама.
**23.10 Камедыя «8 першых спатканняў».*****



**0.45** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05 Фільм для дзяцей. «Папялушка».**
**8.05 22.30** Тэлебарометр.
**8.10** «Ікона стылю». Фэшншоу.
**9.10, 17.20** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**11.00, 20.15, 22.05 Камедыя «Прыкінься маёй жонкай».***
**13.10 Меладрама «Піцер—Масква». 1—4-я серыі.**
**19.15** Суперлато.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Барусія» (Дортмунд, Германія) — «Бенфіка» (Партугалія).
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.

### Беларусь 3

**7.40, 10.45, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**7.55** «Старыя казкі».
**8.20 «Не пакідай...» Фільм-казка.**
**11.00 «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Меладрама.***
**12.35** Канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**13.25 «Цыган». Драма. 1— 4-я серыі.***
**19.15** «Гэта шчасце». Спявае Аляксандр Саладуха.
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «Камертон». Оперная спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Аксана Волкава.
**21.30 «Бітва за Севастопаль». Драма.***

### Беларусь 5

**8.00** Спорт-кадр.
**8.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**9.00** Міні-футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Славакія.
**10.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Арсенал» (Англія) — «Баварыя» (Германія).
**12.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Напалі» (Італія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
**14.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матчы ў адказ. Агляд.
**15.15** Біятлон. Этап Кубка свету. Пхенчхан. Эстафета. Мужчыны.
**16.50** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Першы матч. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. Сёмы матч. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)

**21.40** Козел пра футбол.
**22.00** Слэм-данк.
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Матч у адказ. «Барселона» (Іспанія) — ПСЖ (Францыя). (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)

### АНТ

**7.00, 8.05** «Наша раніца».
**8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **16.00, 20.30** Навіны.
**9.05 Камедыя «Бландзінка за вуглом».***
**10.40 Кіно ў колеры. Маст. фільм «Вясна на Зарэчнай вуліцы».***
**12.30 Камедыя «Прыходзьце заўтра...»**
**14.20 Меладрама «Самая абаяльная і прывабная».*****
**16.15, 20.55** Навіны спорту.
**16.20** «Удача ў прыдачу!» Канцэрт Дзмітрыя Калдуна ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра РБ.
**17.35 Меладрама «Масква слязам не верыць».*****
**21.00** Канцэрт «Пра што спяваюць мужчыны».
**22.50 Камедыя «Статус: свабодны».*****



**0.30** «Вячэрні Ургант».

### СТБ

**6.40 Меладрама «Сабрына».***
**8.35 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі».0**
**10.10, 13.45 Маст. фільм «Скарлет». 1—4-я серыі.*****
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Аўтапанарама». Спецыяльны выпуск.
**17.05 Камедыя «Беражыце жанчын».***
**19.55** «СТБ-спорт».
**20.00** Святочны канцэрт «Нашы любімыя».
**22.00 Камедыя «Мы з джаза».***
**23.35 Маст. фільм «Жаночыя інтрыгі».***

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**6.50 Маст. фільм «Пра Чырвоную Шапачку».***
**9.30** «Любімыя акцёры 2.0».*
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15, 16.15, 1.30 Маст. фільм «Госця з будучыні».**
**16.50 Маст. фільм «Зіта і Гіта».*****
**19.40 Маст. фільм «Не можа быць!»***
**21.30 Маст. фільм «Формула кахання».***
**23.15 Маст. фільм «Амелі».*****

### РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Жанчыны».0**
**9.05** «Бабы, наперад!» Святочная праграма Алены Сцепаненка.
**11.30** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00, 14.20 Серыял «Цыганскае шчасце».**
**14.00, 20.00** Весткі.
**18.30, 20.35** «Петрасян і жанчыны».

**21.40 Маст. фільм «Пацалункаў мост».***
**23.25** Святочнае шоу Валянціна Юдашкіна.

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** «Таямнічая Расія».
**6.50, 8.20 Серыял «Адвакат».*****
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.55, 10.20 Маст. фільм «Выйсці замуж за генерала».*****
**11.15, 16.20 Серыял «Марскія д'яблы».*****
**17.10 Дэтэктыў «Барс і лялька».****
**19.25 Серыял «Цэзар».*****
**21.15 Серыял «Настаўнік у законе. Схватка».**
**22.50 Маст. фільм «Чалавек ніадкуль».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Целаахоўнік».*****
**13.10 Серыял «Вялікая перамена».***
**14.20 Камедыя «Двое — я і мой цень».***
**15.55, 19.25, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.50 Серыял «Каўчэг».***
**18.00 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».*****
**19.00** «Мой любімы гадаванец».
**19.30 Серыял «Выкрадзеныя».*****
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Галава ў аблоках».*****
**23.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».******

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**6.30** «Уральскія пельмені». На старт! Увага! Сакавік!
**8.00** М/ф «Тры каты».
**8.20** М/ф «Смяшарыкі».
**8.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.55** М/ф «Машыны казкі».
**9.00** Анімацыйны фільм «Замбезія».
**10.40** Камедыя «Гатэль для сабак».
**12.40** Меладрама «З 8 Сакавіка, мужчыны!»



**14.50** Анімацыйны фільм «Монстр у Парыжы».
**16.40, 1.30** «Уральскія пельмені». Прыгажосць вырату мымра.
**18.10, 2.45** «Уральскія пельмені». З мілым рай і ў буціку.
**19.40** «Уральскія пельмені». Гаспадыня медная патэльні.
**21.10** Меладрама «Як пазбавіцца ад хлопца за 10 дзён».
**23.30** Камедыя «Муві-43».
**4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.30** «Лаві момант».
**5.00** «Празорлівая».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.05** «Містар Ікс». Маст. фільм.
**11.35** «Чароўная Глікерыя». Дак. фільм.
**12.20, 0.45** «Вясновыя гісторыі». Дак. фільм.
**13.15, 1.55** Міжнародны фестываль цырка ў Монтэ-Карла.
**14.15** 95 гадоў з дня нараджэння Яўгена Мацвеева. «Каханне і лёс». Дак. фільм.
**14.55** «Уваскрэсенне». Маст. фільм.
**18.10** «Рамантыка рамансa». Гала-канцэрт.
**20.15** «Зорка нарадзілася». Маст. фільм.
**23.05** «Каралева чардаша». Ганна Нятрэбка і Хуан Дыега Флорэс у гала-канцэрце з Дрэздэна.
**1.40** «Лятучы карабель». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.***
**7.00, 8.35, 9.40, 15.40, 20.05, 21.40, 23.00, 0.40, 2.05, 3.15** Музычная настальгія.*
**7.20** Маст. фільм «Аферысты».***
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**11.00** Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і яго гурта «Акварыум». 1990 год.***
**12.00** «Вячэрнія мелодыі». 1984 год.*
**12.45** Маст. фільм «Безыменная зорка».***
**17.00** «Гэта было ндаўна, гэта было даўно...» Андрэй Міронаў. 2001 год.*
**18.00** Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».***
**20.25** «Ранішняя пошта». 1986 год.*
**0.00** «Акулы пяра». Таццяна Буланава. 1994 год.***
**1.00** Маст. фільм «Васіліса Прыгожая».***
**2.20** Праграма «Вясёлыя рабяты». 1983 год.***
**3.30** Маст. фільм «Амаль смешная гісторыя».***

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 11.30, 21.00** Снукер. The Players Championship.
**5.00, 8.30, 14.00** Біятлон. Кубак свету.
**6.00, 9.30, 13.00, 15.00** Лыжныя віды спорту. Чэмпіянат свету.
**10.30, 17.30, 1.00** Веласпорт. Парыж — Ніца.
**16.00** Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
**17.15** Watts.
**19.00** Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка.
**20.00, 2.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**1.10** Меладрама «Галівудскі фінал».*
**3.15** Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».*
**5.20** Камедыя «Развод паітальянску».*
**7.10** Камедыя «9 месяцаў строгага рэжыму».***
**8.40** Камедыя «Дапамажыце стаць бацькам».***
**10.25** Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзін».****
**12.15** Камедыя «Вялікая Афрадыта».***
**14.00** Меладрама «Сняданак у ложак».***
**15.35** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.00** Меладрама «Домік у сэрцы».***
**17.40** Камедыя «Ёсць ідэя» (1-я серыя).***
**18.30** Камедыя «Ёсць ідэя» (2-я серыя).***
**19.30** Камедыя «Жаніх».*



**21.10** Камедыя «Джунглі».
**22.40** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Тайны нашага кіно. «Пакроўскія вароты».
**10.35** «Пакроўскія вароты». Камедыя.0



**13.10** «Мужчына і жанчына. Адчуйце розніцу». Дак. фільм.
**14.40** «Мадагаскар». Анімацыйны фільм.0
**16.15, 2.45** «Жонка напракат». Камедыя.*
**20.05** «Тытанік». Драма.***
**23.55** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.40** «Прывід». Фэнтэзі.*

### ТБ1000

**6.10** Блакітная лагуна.***
**8.20** Вяртанне ў Блакітную лагуну.***
**10.30** Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая.***
**13.05** Лізавета.***
**15.35** Герцагіня.***
**17.45** Марыя — каралева Шатландыі.***
**20.10** Марыя-Антуанэта.***
**22.45** Сетка.***
**1.10** Іствікскія ведзьмы.***
**3.40** Матч-пойнт.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Канец выдатнай эпохі. Пра фільм і не толькі.
**6.50** Канец выдатнай эпохі.***
**8.40** Каляфутбола.***
**10.40** Зімы не будзе.***

**12.20** Мы з будучыні.***
**14.30** Легенда №17. Мікалай Лебедзеў.*
**16.50** Пяць нявест.***
**18.50** Пятніца.***
**20.30** Статус: свабодны.***
**22.20** Духless-2.***
**0.20** Шпіён.***
**2.30** Тэрмінова выйду замуж.***
**4.40** Бармен.***

### National Geographic

**6.00, 13.20, 20.15** Гульні розуму.*
**6.45, 9.25, 17.55, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.50, 11.00, 14.50** Мегазаводы.*
**8.40, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**10.10, 22.30** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.***
**11.45, 16.25, 19.25, 23.15, 2.15** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.35, 18.40, 21.45, 1.30, 4.45** Космас: прастора і час.*
**21.00, 0.45, 3.55** Золата Юкана.*

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітва за нерухомасць.*
**11.00** Майстры патаргаваца.*
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары на трасе.*
**18.00** Паляўнічыя на склады.***
**19.00** Ліквідатар.***
**20.00** Тэхнагеніка.*
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.***
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** На гэтым тыдні ў вас з'явяцца новыя дзелавыя партнёры і заступнікі, у сувязі з гэтым вы можаце рэалізаваць самыя дзёрзкія планы, стварыць добры зачын на будучыню, палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Удача спадарожнічае вам у самых розных пачынаннях. Першая палова будзе поўная цікавых і нават загадкавых сустрэч і запомніцца вам надоўга. У пятніцу пастарайцеся паменш напружвацца на працы. У выхадныя не выключаны праблемы з пажылымі бацькамі, а таксама візіт кагосьці са сваякоў.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы можаце занадта захапіцца пабудовай стратэгічных планаў, куды лепш заняцца рашэннем надзённых праблем. Аўторак і серада — не самы лепшы час, каб спрабаваць паскараць вырашэнне пытанняў, звязаных з працай. Хай усё ідзе сваёй чаргой. Неабходна сканцэнтравацца на бягучых справах і не спрабаваць «лавіць жураўля», бо гэта не прынясе ніякага поспеху. Канец тыдня будзе поўны перагавораў і сустрэч, пераканайцеся, што вас разумеюць правільна, каб пазбегнуць цяжкасцяў у будучыні.

**БЛІЗНЯТЫ.** Пачатак тыдня можа быць вельмі напружаным, але цікавым і плённым. Вялікі шанц знайсці сродкі для рэалізацыі сваіх ідэй. Вы будзеце адчуваць падтрымку навакольных у сваіх пачынаннях. Не бойцеся часовых няўдач ці нейкіх выдаткаў, яны працягнуцца нядоўга і ў хуткім часе ўсё ўвойдзе ў патрэбнае рэчышча. Магчымы пазітыўныя перамены на працы і ў асабістым жыцці. Пятніца спрыяльная для паездак і падарожжаў. Паспрабуйце быць цікавымі і абаяльнымі суразмоўнікамі. У выхадныя трэба аднавіць затрачаныя сілы.

**РАК.** Тыдзень абяцае быць лягчэйшым за папярэдні, але трывог і хваляванняў усё роўна не пазбегнуць. Паспрабуйце засцерагчы сябе ад непажаданых кантактаў і зайздросных людзей. У аўторак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У сераду пажадана быць больш асцярожнымі пры зносінах з калегамі і сябрамі, упартасцю вы наўрад ці дасягняце жаданых вынікаў. У чацвер магчыма цікавая прапанова з боку начальства. З фінансавага пункту гледжання ўсё добра і спакойна.

**ЛЕЎ.** Захопленасць працай заўсёды пахвальная, толькі не даводзьце сябе да знясілення. Не забывайце пра хатнія справы, інакш да канца тыдня вы назапасіце такую іх колькасць, што не зможаце справіцца. Паспрабуйце праявіць паблажлівасць да калег, яны абсалютна шчырыя ў сваіх памылках. Адзін у полі не воін, і калі вы, імкнучыся за сваімі ідэаламі, пасварыцеся з усімі навакольнымі, то нічога не дасягняце. У сярэдзіне тыдня можаце адчуць пэўнае эмацыйнае напружанне, паспрабуйце звесці яго да мінімуму.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні вы можаце паспяхова справіцца са складанымі справамі. Будзьце асцярожныя і абачлівыя, падпісваючы важныя дакументы. Не адмаўляйцеся ад камандзіровак. Яны могуць прынесці вам прыбытак, а заадно дапамогуць развеяцца ад сумных думак. Пачынаючы з чацвярга адчуеце прыліў сіл і энергіі. У пятніцу давядзецца прадэманстраваць віртуознасць у прафесійных справах. Выкарыстоўвайце прывабнасць, дыпламатычныя здольнасці і зможаце дамагчыся рэалізацыі ўсіх сваіх задум.

# ШАШКІ

**Выпуск №32**

У мінулых выпусках мы разгледзелі пазіцыі з пазіцыйнай гульнёй. Сёння прапануем паглядзець цікавы фрагмент з партыі гросмайстраў, дзе пазіцыйная гульня падмацоўвае тактоўнымі ахвярамі.

**№54** В. Скрабаў — А. Гетманскі

**Белыя простыя шашкі:** c1, d2, e1, e3, e5, f4, g1 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, b6, d8, f8, g5, h4 (7)

Ацэнім пазіцыю на дыяграме №54. У белых магутны цэнтр і фарпост на полі e5. У чорных разрыў па флангах і слабыя бартавыя шашкі a3, a5.

1 ... a5-b4. Небяспечна гуляць (1 ... b6-c5? З-за наступнага варыянта 2. d2-c3 f8-g7 3. c3-d4 d8-e7 4. d4xb6 a5xc7 5. g1-f2 (!) E7-d6 6. e1-d2 d6-c5 7. f2-g3 g5 -h4 8. e5-f6 (!) [x].)

2. d2-c3 b4xd2 3. e1xc3 d8-c7 4. c3-d4 (!) F8-g7 5. g1-f2 g5-h4 6. f2-g3h4xf2 7. e3xg1 b6-a5.

Магчыма, самая моцная абарона, бо на размен( 7 ... g7-f6 8. e5xg7 h6xf8 адбудзецца выпад 9. f4-e5 (!) З пераможнай ахвярай пасля 9 ... b6-a5. (9 ... f8-e7 10. g1-f2 [x] ). 10. d4-c5 a5b4 11. e5-f6! b4xd6 12. f6-e7 [x] і г. д.) 8. g1-f2?

пасля (8. d4-c5 (!) h4-g5 9. c5-d6 c7-b6 10. d6-e7 g7-f6 11. e7xg5 b4-c3 12. g5-f6 c3-b2 13. f6-e7 b2-a1 14. e5-d6 [++ -] белыя атрымліваюць эндшпіль з лішняй шашкай, магчыма, дастатковы для перамогі.) 8 ... c7-b6 9. f2-e3 b6-c5 10. d4xb6 a5xc7 11. e3-d4 c7-b6 12. e5-d6 g7-f6 13. f4-e5 b6-c5 (!) [=], і чорныя здолелі звесці партыю да нічыёй.

Для самастойнага рашэння прапануюцца камбінацыйныя ідэі, якія даслаў па пошце наш чытач Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада, Мінскі р-н).

**№55**

**Белыя простыя шашкі:** a3, b2, d4, f2, f4, h6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** b6, d2, f6, f8, g7, h2, h4 (7)

**№56**

**Белыя простыя шашкі:** a1, a7, b2, d4, e3, e5, f4, h4 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, b6, b8, c5, c7, e7, f8, g7 (8)

У абедзвюх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.



У першай палове лютага ў сталіцы Латвіі адбыўся міжнародны турнір па шашках-100 Riga Open 2017. У спаборніцтвах узялі ўдзел 66 шашыстаў з дзесяці краін. Добра згулялі беларускія шашысты. Дзмітрый Немец перамог у заліку юніёраў — 9 ачкоў і 9 месца ў агульным турніры. Сёстры Дар'я і Вольга Федаровіч таксама набралі па 9 ачкоў і размясціліся на 14 і 15 месцах у агульным турніры, што дазволіла ім заваяваць другі і трэці прызы ў жаночым заліку. А перамог у спаборніцтвах нідэрландскі шашыст M. de Kruijf, які набраў 10 ачкоў з 14 магчымых.

**Праверце свае рашэнні:**

**Выпуск №31 ад 17.02.17.**

№52 d8, h4, g1(h2), c3(e3), e1(ЧПР — e7(d4), f6(de3), bc3(g3), cd4, h4x) x ППР — f8, e7, g1 x (Паведаміў В. І П. Шульгі).

№53 bc7, f2, f8, ЧПР a3x; ЧПР d2 +

Правільныя адказы даслалі В. Ваўчкоў (Маладзечна), У. Бандарык (Мінскі р-н), А. Ліцьвінаў, П. і В. Шульгі (Мінск), П. Аніканаў (Шчучын), А. Шурпін (Клімавічы), І. Ананіч (Гродна), В. Талкачоў (Клімавіцкі р-н).

*Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда», e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Пятніца, 10 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Практыка».***
**12.10, 17.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Закаханыя жанчыны».*****
**20.00 Серыял «Практыка».***
**21.00** Панарама.
**21.45** Жанчыны і спорт. Алена Леўчанка.
**22.15 Меладрама «Апошняя ахвяра Ганны».*****
**1.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.40** Тэлебарометр.
**9.05, 18.50 Серыял «Апошні з Магікян».*****
**10.10, 17.25 Дэтэктыў «Такая работа».*****
**11.00, 16.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».***
**11.55** Нас не падманеш.
**12.30, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.15** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**18.15** «Пра ежу».
**21.30, 22.10** «Бітва экстрасэнсаў». 14-ы сезон.
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.45 Трылер «Параноя».*****

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Тварожная бабка з яблыкамі.
**8.00, 12.00, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Ясенін». Драма.*****
**9.10, 14.40 «Паляванне на ліс». Драма.***
**10.40** «Гітара па крузе».
**11.35** «Сіла веры».
**12.15** «Наперад у мінулае».
**12.45** «Эпоха». Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.
**13.35** «Шлягеры на ўсе часы». Канцэрт з твораў Аляксандра Зацэпіна.
**16.10** «Паглыбленне. Уладзімір Гасцюхін».
**17.05, 21.30 «Выйсці замуж за капітана». Меладрама.***
**19.25** «Музеі Беларусі». Музей беларуская кнігадрукавання. Музей- бібліятэка Сімяона Полацкага.
**19.55** «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Ноч на Каляды».
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «Камертон». Мастачка Марына Эльяшэвіч.

### Беларусь 5

**8.00** Авертайм.
**8.25** Тэніс. Турнір WTA. Індыян — Уэлс.
**10.30** Фрыстайл. Чэмпіянат свету. Лыжная акрабатыка. Кваліфікацыя. Жанчыны.
**11.15** Фрыстайл. Чэмпіянат свету. Лыжная акрабатыка. Кваліфікацыя. Мужчыны.
**12.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Ліён» (Францыя) — «Рома» (Італія).
**14.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Шальке-04» (Гельзенкірхен, Германія) — «Барусія» (Менхенгладбах, Германія).
**16.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Кантыялахці. Спрынт. Мужчыны.
**17.45** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Растоў» (Расія) — «Манчэстар Юнайтэд» (Англія).
**19.30, 23.25** PRO спорт. Навіны.
**19.35, 23.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Кантыялахці. Спрынт. Жанчыны.
**21.00** Піт-стоп.
**21.25** Фрыстайл. Чэмпіянат свету. Лыжная акрабатыка. Жанчыны. Мужчыны. Фінал.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Адваротны адлік». «Пётр Сталыпін. Стаўка на Вайніловіча».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Час пакажа».
**16.20 Меладрама «Насця».*****
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Штрафнік».*****
**0.50** «Вячэрні Ургант».
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.25** «Далёкія сваякі».
**9.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Нектар багоў».
**11.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.35 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Адкрытая размова».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Хто кіруе светам?»
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.50** Святочны канцэрт «Нашы любімыя».
**1.40** «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

**6.00, 4.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00** «Зроблена ў СССР».*
**9.25 Маст. фільм «Зіта і Гіта».*****
**12.00** «Цяжар абеду».*
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы».***
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20 Маст. фільм «Чужыя мары».***
**23.00 Маст. фільм «Фініст — Ясны сокал».**
**0.15** «Трымайся, шоубіз!»*
**0.40** «Я — валанцёр».*
**1.15 Маст. фільм «Формула кахання».***
**3.00 Маст. фільм «Карасі».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Вераніка. Уцякачка».**
**19.15, 20.40 Серыял «Паштальён».**
**22.00, 23.10 Серыял «Чужое шчасце».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 07.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Таямнічая Расія».***
**7.05, 8.05 Серыял «Адвакат».*****
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».*****
**9.45, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Пчаляр».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Дудачка пацукалова».*****
**23.25 Маст. фільм «Знайдзі мяне».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Трылер «Голдфінгер».*****
**13.00 Серыял «Вялікая перамена».***
**14.05 Меладрама «Алоха».***
**15.55, 19.25, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.45** «Адшукваецца адпачынак».
**17.15 Серыял «Каўчэг».***
**18.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».*****
**19.30 Серыял «Выкрадзеныя».*****
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Пра будаўніцтва і нерухомасць».
**21.20 Баявік «Рыцар дня».*****
**23.10 Серыял «Амерыканская гісторыя жахаў».******

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.20** М/ф «Смяшарыкі».
**7.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**7.55** М/ф «Машыны казкі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 16.50** Серыял «Вароніны».
**9.40** Камедыя «Лета. Аднакласнікі. Каханне».
**11.40** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00, 5.00** Серыял «Сакратар».
**13.00** «Паспецьь за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Мамачкі».
**15.10** Серыял «Маладзёжка».
**16.20** Серыял «Сям'я 3D».
**18.00** «Узважаныя людзі».
**20.00, 1.30** «Уральскія пельмені».
**21.30** Драма «Добрая раніца».
**23.40** Жахі «11—11—11».
**3.00** Скетчкам «Студэнты».
**4.00** «Новае жыццё».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** «Да хуткай сустрэчы». Маст. фільм.
**11.50** Сусветныя скарбы.
**12.05** «Дом на Гульвары». Дак. фільм.
**13.05** «Пісьмы з правінцыі». Кіржач (Уладзімірская вобласць).
**13.30** «Ці была Клеапатра забойцай?» Дак. фільм.
**14.30** З гісторыі расійскай журналістыкі. «Някрасаў». Фільм 2-і.
**15.10** «Гісторыя Глена Мілера». Маст. фільм.
**17.05** «Выходзяць на арэну асілкі. Яўген Сандаў і Юрый Уласаў». Дак. фільм.
**17.50** «Царская ложа».
**18.35** «Церам-квартэту» — 30! Канцэрт у ММДМ.
**19.45** Смеханастальгія.
**20.10** «Шукальнікі». «Золата атамана Перакаці-поле».
**20.55** «Старая, старая казка». Маст. фільм.
**22.30** «Лінія жыцця». Мікалай Лебедзеў.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Партрэт пакалення. «Геаграф глобус прапіў». Маст. фільм.***
**1.55** «Насельнікі балот». Дак. фільм.
**2.50** «Наваі». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».***
**8.00, 8.35, 9.40, 11.00, 14.35, 15.40, 17.00, 19.10, 20.20, 21.40, 23.00, 3.40** Музычная настальгія.*
**8.25** «Ранішняя пошта». 1986 год.*
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00, 16.00, 24.00** «Народжаны ў СССР».*
**12.00** «Сляем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.*
**13.05** Маст. фільм «Печкі-лавачкі».***
**17.25** Дак. фільм «Аляксандр Разэнбаам. Твар у твар».***
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1973. 1-я частка. 2010 год.***
**19.30** Маст. фільм «Начны госць».***
**22.00** «Колба часу».***
**0.00** «Вячэрнія мелодыі». 1984 год.*
**0.45** Маст. фільм «Безыменная зорка».***
**5.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Андрэй Міронаў. 2001 год.*

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 11.30** Снукер. The Players Championship.
**5.00, 8.30, 13.30** Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
**6.00, 15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**9.30, 18.45, 1.45** Веласпорт. Цірэна — Адрыятыка.
**10.30,14.30, 17.30, 1.00** Веласпорт. Парыж — Ніца.
**13.00** Watts.
**16.15, 19.30, 2.30** Біятлон. Кубак свету.
**20.45,23.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**22.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**1.00** Камедыя «9 месяцаў строгага рэжыму».***
**2.30** Меладрама «Кранўты».***
**4.25, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**5.10** Меладрама «Галівудскі фінал».*
**7.15** Камедыя «Вялікая Афрадыта».***
**9.00** Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзін».****
**10.50** Камедыя «Жаніх».*
**12.30** Камедыя «Джунглі».
**14.20, 15.10, 16.00** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.35** Мюзікл «Як стаць зоркай» (1-я серыя).***
**18.00** Мюзікл «Як стаць зоркай» (2-я серыя).***
**19.30** Камедыя «Супермозг».***
**21.30** Камедыя «Няхай жыве Францыя!»***
**23.15** Камедыя «Ас».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45, 15.05** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.10** «Доктар І...»
**8.40** «20 хвілін». Серыял.
**10.15, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.00** «Сляпая».
**13.00** «Варажбітка».
**14.05** «Паралельны свет».
**15.35** «Здзелка».
**16.10, 5.15** «Не злуйце дзяўчынак».
**17.05** «Рэвізора».
**18.10, 2.55** «Бітва рэстаранаў».
**19.15, 1.35** «Добры дзень, я ваша Пятніца».
**20.55** «Хэнкок». Фантастыка.*
**22.50** «Апакаліпсіс».
**23.50** «Карты, грошы, два ствалы». Камедыя.****

### ТБ1000

**8.10** Найлепшае ўва мне.*
**10.25** Тры метры над узроўнем неба.***
**12.45** Манглхорн.***
**14.40** Задыяк.***
**17.35** Спадар Ніхто.*
**20.10** Помні (Memento).****
**22.20** Прыстанак праклятых.***
**0.30** Трусіная нара.***
**2.20** Аднакласнікі.***
**4.10** Там, дзе сэрца.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Варашылаўскі стралок.***
**8.25** Аднойчы.***
**10.35** Жывы.***
**12.35** Не бойся, я з табой. 2-я частка.*
**14.30** Удваіх на крызе.*
**16.30** Ржэўскі супраць Напалеона.***
**18.20** Гэта твой дзень.0
**20.20** Мечаносец.***
**22.25** Ч/Б.***
**0.15** Афінскія вечары.***
**2.10** Канец выдатнай эпохі. Пра фільм і не толькі.
**2.50** Канец выдатнай эпохі.***
**4.50** Зімы не будзе.***

### National Geographic

**6.00, 13.20, 20.15** Гульні розуму.*
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 11.00, 14.50** Мегазаводы.*
**8.45, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**9.30, 11.50, 16.25, 19.30, 23.15, 2.20** Расследаванні авіякатастроф.*
**10.15, 22.30** Эвакуацыя Зямлі.***
**12.35, 18.40, 21.45, 1.30, 4.45** Космас: прастора і час.*
**21.00, 0.45, 3.55** Твар у твар.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.***
